# ГІСТОРЫЯ ЯК ФОРМА МЕМАРЫЯЛІЗАЦЫІ ВАЕННЫХ КАНФЛІКТАЎ

***Д. С. Самахвалаў***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г.Мінск, Беларусь, dzsarea.com@tut.by*

Гісторыя – частка культурнага ўзроўню сацыяльнай памяці. Як форма мемарыялізацыі ваенных канфліктаў яна змяняецца, набывае новую праблематыку, але цалкам не можа пазбегнуць суб’ектыўнасці, што ўскладае на гісторыка як даследчыка асаблівую адказнасць.

***Вызначальныя словы:*** ваенная гісторыя; голад; сінтэз падыходаў; суб’ектывізм; гістарычная рэканструкцыя.

# HISTORY AS A FORM OF MEMORIALIZATION OF MILITARY CONFLICTS

***D. Samakhvalau***

*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author:dzsarea.com@tut.by*

History would be seen as a part of the cultural level of the social memory, and as a form of memorialization of military conflicts it develops and explores new facts and problems. But it is not free of author’s tendencies and thus it bears the personal responsibility of historians.

***Keywords:*** military history; famines; synthesis approach; subjectivism; historical reconstruction.

Аднойчы М. Феро заўважыў, што гісторыя, незалежна ад яе цягі да навуковых ведаў, выконвае дзве функцыі: лекавання і барацьбы. На яго думку, гісторыя заўсёды застаецца місіянерскай; навукападабенства і метадалогія толькі затуляюць ідэалогію [2, с. 9– 10]. У такім разе гісторыя, падобна літаратуры, выступае у якасці часткі культурнага узроўню сацыяльнай памяці. І гісторыя, і літаратура могуць з’яўляцца аўтарскай рэфлексіяй на падзеі мінулага. Аднак літаратура засноўваецца на мастацкіх прыёмах апісання, а гісторыя – на даследаванні. Такім чынам гісторыя прэтэндуе на большую аб’ектыўнасць і давер з боку свайго чытача.

Ваенныя канфлікты суправаджаюць чалавецтва са старажытных эпох, аказваюць глыбокае ўздзеянне на ўсе бакі яго існавання, а таму не могуць заставацца па-за колам інтарэсаў гісторыкаў. Гісторыя як асобны жанр узнікла ў антычнасці менавіта як форма мемарыялізацыі ваенных канфліктаў. Герадот, Фукідыд, Ксенафонт і пазнейшыя антычныя гісторыкі ставілі перад сабою мэту захавання памяці пра мінулае, і цэнтральнымі падзеямі ў гэтым мінулым выступалі войны. Лукіян з Самасаты лічыў пачатак ваенных дзеянняў галоўнай падставай для напісання гістарычных твораў. Ён з сарказмам заўважаў: «Вайна – маці ўсяго, калі адным рухам стварыла столькі гісторыкаў» [1, с. 82]. Але ўжо ў яго час было зразумела, што бесстароннее апісанне вайны ўяўляе сабою

складаную задачу, таму ён раіў гісторыкам лічыцца не з сучаснікамі, а з чытачамі іх твораў у будучыні.

Гісторыку пачатку XXI ст. парада Лукіяна можа падацца некалькі наіўнай. Яго ўвага першасна сканцэнтравана на пастаноўцы праблемы, што вызначыць кола крыніц і змест даследавання, на падыходзе, які сфарміруе ўнутраны кантэкст, на шляху перадачы даследаванага матэрыялу і г. д. У выніку ўсё гэта так паўплывае на яго працу, што наўрадці атрымаецца поўнасцю пазбегнуць суб'ектыўнасці. Тым не меней, колькасць гістарычных прац, прысвечаных ваеннай тэматыцы, з кожным дзесяцігоддзем павялічваецца, а праблематыка і падыходы – пашыраюцца. Відавочна, што гэта тэндэнцыя сведчыць аб сацыяльным запыце, які існуе на сусветным узроўні.

У якасці прыкладу такога пашырэння з'яўляецца праблема голаду падчас другой сусветнай вайны. Яна існавала ў гістарыяграфіі і раней, аднак амаль не вылучалася ў якасці асобнай. Сітуацыя можа падацца дзіўнай, паколькі голад нароўні з гвалтоўнымі забойствамі быў адной з распаўсюджаных пакут, што адлюстроўваліся ва ўспамінах сведак падзей, архіўных матэрыялах і публікацыях у сродках масавай інфармацыі таго часу. Выключэнне даследчыкамі рабілася толькі ў некаторых выпадках – апісанні злачынстваў нацысцкага рэжыму ў адносінах да вязняў канцлагераў, подзвіга жыхароў блакаднага Ленінграда і масавага голаду ў Бенгаліі і Хэнані. Характэрна, што нават у Беларусі, дзе на працягу некалькіх пасляваенных дзесяцігоддзяў і ў наш час даследчай тэматыцы Вялікай Айчыннай вайны адводзіцца заўважнае, калі не прыярытэтнае месца, слова «голад» амаль адсутнічае ў адпаведных раздзелах падручнікаў па гісторыі. Іх аўтараў можна было б абвінаваціць у ігнараванні антрапалагічнага вымярэння на карысць ідэалагічнаму, але і тыя гісторыкі, што з канца мінулага стагоддзя дэкларавалі выкарыстанне новых падыходаў, разглядалі праблему толькі ў сукупнасці з іншымі, далёка ад асноўнай.

З пачатку XXI ст. голад падчас вайны ўжо вылучаецца ў якасці самастойнага даследчыцкага пытання, прычым абмяркоўваецца з розных бакоў. Так, брытанскі гісторык Л. Колінгхэм у сваёй кнізе «Смак вайны: другая сусветная вайна і бітва за ежу» [3] выказвае думку пра тое, што клопат пра забеспячэнне насельніцтва ежай быў адной з прычын палітычнага размежавання ў міжваенны перыяд. Паскораную калектывізацыю ў СССР, імкненне Японіі, Італіі і Германіі пашырыць іх межы шляхам каланізацыі іншых народаў яна тлумачыць незадаволенасцю гэтых дзяржаў сістэмай свабоднага гандлю пад кантролем Вялікабрытаніі. Нават у развітых краінах сельская гаспадарка заставалася малаэфектыўнай, многія фермы не мелі вады і электразабеспячэння. У Японіі і на поўдні ЗША недаяданне сярод сельскага насельніцтва было звычайнай справай. З пачаткам вайны недахоп харчу і голад пераўтварыліся ў гуманітарную катастрофу, якая прывяла да смерці каля 20 мільёнаў чалавек. Л. Колінгхэм падымае важнае пытанне права на ежу ва ўмовах яе недахопу, якое абумоўлівалася культурай і ідэалогіяй ваюючых бакоў. Яна абвінавачвае нацысцкую Германію ў наўмысным стварэнні голаду сярод акупаванага насельніцтва Усходняй Еўропы і вязняў канцлагераў. Японскае камандаванне не ставіла мэты знішчэння насельніцтва шляхам галоднай смерці, але мала клапацілася пра забеспячэнне не толькі мірных жыхароў, але і простых салдат сваёй арміі. Нямецкія і савецкія салдаты часцяком здабывалі харч самастойна, што пераўтваралася ў рабаванне навакольных жыхароў. Права на харч

вызначала сацыяльнае становішча тых, хто заставаўся ў тыле, але сутыкаўся з нястачамі. Адзінай краінай, якая справілася з забеспячэннем, сталі ЗША, дзе выкарыстоўваліся новыя тэхналогіі ў сельскай гаспадарцы і харчовай прамысловасці, узрасло спажыванне хімічных угнаенняў, пестыцыдаў і кансервантаў. Культурным вынікам гэтага стала распаўсюджванне амерыканскага ладу харчавання ва ўсім свеце.

Праца Л. Колінгхэм з'яўляецца сінтэзам адразу некалькіх падыходаў – сацыяльнага, антрапалагічнага, псіхалагічнага і культурнага. Яны дапамагаюць гісторыку паказаць не толькі важнасць разгляду праблемы голаду, але і тое, што вайна можа перафармоўваць чалавечыя адносіны да звыклых рэчаў, мець працяглы ўплыў на самыя розныя бакі жыцця, што не заўсёды заўважна нават праз дзесяцігоддзі.

Такая ж ідэя сінтэза падыходаў ляжала ў аснове гістарычнага зборніка «Пераадоленне голаду і нястач пад нямецкай акупацыяй у другой сусветнай вайне», выдannага ў Лондане. Мэтай яго аўтараў было паказаць вопыт выжывання простых людзей з розных акупаваных краін Еўропы. Адметна, што ў ім прынялі ўдзел беларускія даследчыкі А. Смалянчук і Т. Касатая. Дзякуючы аналізу вуснай гісторыі яны выявілі розныя стратэгіі сельскага насельніцтва для захавання сваёй маёмасці ва ўмовах ваеннага супрацьстаяння, але, як прызналіся самі аўтары, сабраныя імі вусныя ўспаміны цалкам не адлюстроўваюць праблему забеспячэння харчам у гады акупацыі [8, с. 57]. Тым не меней, іх вопыт даследавання дэманструе перспектывы выкарыстання метадаў вуснай гісторыі, паколькі аб'ядноўвае індывідуальны і культурны ўзроўні сацыяльнай памяці.

Яшчэ адзін зборнік «Голад і вайна» [4], прысвечаны дзяржаўнай палітыцы забеспячэння харчам у СССР у гады Вялікай Айчыннай вайны, быў выдадзены Індыянскім універсітэтам (ЗША). У ім разглядаюцца пытанні забеспячэння гарадскіх рабочых і арміі, голаду ў блакадным Ленінградзе, смяротнасці ад нястач і хвароб у тыле. Тэматычныя артыкулы звычайна спасылаюцца на архіўныя матэрыялы або даследаванні савецкіх вучоных. Толькі артыкул пра жыхароў Ленінграда напісаны пераважна на аснове захаваных успамінаў у форме дзённікаў. Аўтары раскрываюць нацысцкія планы генацыду народаў СССР шляхам галоднай смерці, абвяргаюць устойлівыя ўяўленні пра размеркаванне прадуктаў у савецкім тыле ў залежнасці ад наменклатурнага статусу тых, хто іх атрымоўваў, прызнаюць поспех савецкага ўрада ў забеспячэнні салдатаў усталяванымі нормамі бялкоў і калорый. Разам з гэтым, паказваюцца нястачы ў ежы, якое адчувала мірнае насельніцтва. Голад і недаяданне правакавалі ўспышкі хвароб, што павышалі ўзровень смяротнасці. У першую пару ад іх болей пакутвалі адчувальныя групы насельніцтва – старыя і дзеці. Пазней урачы блакаднага Ленінграда заўважылі гендарную дыспрапорцыю сярод дарослых ахвяр голаду. Мужчыны паміралі значна часцей, чым жанчыны. У апошнім раздзеле зборніка прыводзяцца лічбы, якія падцвярджаюць дадзеную тэндэнцыю для астатніх рэгіёнаў савецкага тыла.

У рэчышчы публікацый пра голад падчас вайны вылучіліся тыя, што былі прыняты іншымі гісторыкамі як надзвычай суб'ектыўныя. Прыкладам таму з'яўляецца кніга «Патаемная вайна Чэрчыля» [6]. Яе аўтар – пісьменніца індыйскага паходжання, якая займаецца папулярызацыяй навукі, М. Мукерджы. Яна выкарыстала ўжо вядомыя раней абмеркаваныя факты голаду ў Бенгаліі ў

1943 г., што прывёў да смерці ад 1,5 да 2 мільёнаў чалавек. Да пачатку 1980–х лічылася, што бенгальскі голад быў наступствам неўраджаю і адсутнасці клопату брытанскіх чыноўнікаў пра індыйскіх сялян. У 1981 г. нобелеўскі лаўрэат у галіне эканомікі А. Сен паказаў, што недароды рысу здараліся і раней, але не прыводзілі да масавага бедства; прыпасаў рысу ў 1943 г. было дастаткова для прадухілення голаду, калі б каланіяльная адміністрацыя ўвяла рэжым строгага размеркавання [7, с. 52–85]. Хаця А. Сен ігнараваў тое, што механізмаў кантролю сялянскіх запасаў і размеркавання пакуль не існавала, Бенгалія апынулася ва ўмовах разрыву сувязей з суседняй Бірмай, адкуль перасталі паступаць лішкі збожжа з-за японскай акупацыі, яго праца стала падставай для сцверджанняў некаторых інтэлектуалаў пра штучны характар голаду. М. Мукерджы прасоўвае думку прыхільнікаў менавіта гэтага пункту гледжання. Аднак яна ідзе далей і абвінавачвае ў бенгальскім голадзе непасрэдна У. Чэрчыля, ваенны кабінет якога ўвёў гандлёвыя бар’еры, а сам ён спавядаў расісцкія погляды і быў прадузятым у дачыненні да індыйскіх палітыкаў. Нажаль, у яе кнізе шмат ускосных, а не прамых доказаў, затое прысутнічае моцны эмацыянальны элемент. У прыватнасці, яна сцвярджае, што Гітлер будаваў Трэці рэйх падобным на Брытанскую імперыю і параўноўвае брытанскі імперыялізм з нацызмам. Адступленне ад прынятых сярод гісторыкаў правіл гістарычнай рэканструкцыі, падмена ўліку розных фактараў і з’яў інтуітыўнай здагадкай робіць працу М. Мукерджы надзвычай спрэчнай.

Аднак ці дае выкананне правіл гістарычнай рэканструкцыі гарантыю аб’ектыўнасці? Амерыканскі гісторык Д. Лі паспрабаваў даць станоўчы адказ. Яго кніга «Крэсла афіцэра СС» [5] закранае больш традыцыйную праблематыку, чым голад, – лёс канкрэтнага чалавека на фоне буйных гістарычных падзей міжваеннага і ваеннага перыядаў. Кніга пачынаецца амаль з дэтэктыўнага выпадка, калі ў 2011 г. амстэрдамскі абівальнік знайшоў у старым крэсле пачак дакументаў са свастыкай, якія былі застаўлены Робертам Грызінгерам, юрыстам са Штутгарта і афіцэрам СС, падчас знаходжання ў акупаванай Празе. Па дамове з уладальнікам крэсла Д. Лі прысвяціў 5 гадоў даследаванню жыцця Р. Грызінгера і абставінаў, што падштурхнулі яго далучыцца да ваенных акупантаў. Ён працаваў у архівах, пазнаёміўся з да сёй пары жывымі сёстрамі афіцэра, з іх дазволу прачытаў яго дзённік. Гісторык выявіў, што, хаця Р. Грызінгер спавядаў антысемітызм, ён меў сярод продкаў афраамерыканца і некаторы час не мог вызначыцца ў сваіх адносінах да нацызму. У выніку не ідэалогія, а жаданне кар’ернага росту абумовілі яго далучэнне да нацысцкай партыі і СС. Д. Лі лічыць апошняе злом і папракае героя свайго даследавання за ўдзел у акупацыі.

Як бачым, абодвы, М. Мукерджы і Д. Лі, не пазбягаюць суб’ектыўных адзнак. Аднак адзнака М. Мукерджы вызначае агульны кантэкст яе працы, а адзнака Д. Лі толькі падкрэслівае яго асабістую пазіцыю, з якой можна пагаджацца, а можна і аспрэчыць. Наогул, у гістарыяграфіі існуюць самыя розныя погляды на суб’ектывізм і права гісторыка судзіць. У выпадку гісторыі ваенных канфліктаў рэалізацыя гэтага права становіцца найбольш адчувальнай, ускладае на даследчыка асаблівую адказнасць, а таму гісторыя як форма мемарыялізацыі патрабуе ад гісторыка значных намаганняў, каб заставацца бесстаронні́м, але не абыякавым.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Лукиан Самосатский. Сочинения. Том II. СПб.: Алетейя, 2001.
2. Ферро М. Как рассказывают историю детям в разных странах мира. М.: Высшая школа, 1992.
3. Collingham L. The Taste of War: World War II and the Battle for Food. New York: The Penguin Press, 2012.
4. Hunger and War. Food Provisioning in the Soviet Union during World War II / Ed. by Goldman W., Filtzer D. Bloomington: Indiana University Press, 2015
5. Lee D. The S.S. Officer's Armchair: Uncovering the Hidden Life of a Nazi. New York: Hachette Books, 2020.
6. Mukerjee M. Churchill's Secret War: The British Empire and the Ravaging of India during World War II. New York: Basic Books, 2011.
7. Sen A. Poverty and Famines. An Essay on Entitlement and Deprivation. Oxford: Clarendon Press, 1981.
8. Smalianchuk A., Kasataya T. Economies of Scarcity in Belarusian Villages During World War II: How New Findings from Oral History Projects Put a Perpetrator-Centred Historiography in Perspective // Coping with Hunger and Shortage under German Occupation in World War II. London: Palgrave Macmillan, 2018. P. 49 – 59.